**КАЛІНКАВІЦКІ РАЁННЫ ВЫКАНАЎЧЫ КАМІТЭТ**
пл. Леніна, 1, 247710, г. Калінкавічы,
Гомельскай вобласці
тэл. 4 21 40, факс 3 17 12
УНП 400061401
Бягучы рахунак BY57AKBB36044190021503300000
ЦБП № 313 ф-ла 317 ААТ «АСБ «Беларусбанк»
г. Мазыр
БІК AKBBBY21317
E-mail: mailrik@kalinkovichi.gov.by

**КАЛИНКОВИЧСКИЙ РАЙОННЫЙ ИСПОЛНИТЕЛЬНЫЙ КОМИТЕТ**
пл. Ленина, 1, 247710, г. Калинковичи,
Гомельской области
тел. 4 21 40, факс 3 17 12
УНП 400061401
Текущий счет BY57AKBB36044190021503300000
ЦБУ № 313 ф-ла 317 ОАО «АСБ «Беларусбанк»
г. Мозырь
БИК AKBBBY21317
E-mail: mailrik@kalinkovichi.gov.by

20.05.2020 № Кои-93/252

На № ______________ от ______________

Калінкавіцкі раённы выканаўчы камітэт на Ваш электронны зварот паведамляе наступнае.

Вялікая колькасць пешаходаў па краях праезнай часткі ўздоўж вул.Загарадная ў г. Калінкавічы да могілак «Карчага» налічваецца, як правіла, адзін раз у год, калі адзначаецца свята Радаўніца. У гэты дзень для захавання правілаў дарожнага руху на названай частцы дарогі заўсёды дзяжураць супрацоўнікі аддзела ДАІ аддзела ўнутраных спраў Калінкавіцкага райвыканкама, якія рэгулююць патокі руху аўтамабільнага транспарту і пешаходаў. У выхадныя дні ў гэтым напрамку працуе грамадскі транспарт і маршрутныя таксі.

Сёння ў г.Калінкавічы маюцца ўчасткі дарогі з больш ажыўленым штодзённым рухам аўтамабільнага транспарту і пешаходаў уздоўж праезнай часткі. У сувязі з гэтым у першачарговым парадку распрацоўваецца неабходная тэхнічная дакументацыя для будаўніцтва тратуарных дарожак па вул.Марата і вул.Першамайская ў г. Калінкавічы.

У цяперашні час будаўніцтва тратуарнай дарожкі па вул.Загарадная ў г. Калінкавічы да могілак «Карчага» не плануецца.

На падставе артыкула 20 Закона Рэспублікі Беларусь "Аб зваротах грамадзян і юрыдычных асобаў" адказ на зварот можа быць абскарджаны ў Гомельскі абласны выканаўчы камітэт. Адказ на зварот пасля абскарджання ў вышэйстаячую арганізацыю можа быць абскарджаны ў суд у парадку, устаноўленым заканадаўствам.

Намеснік старшыні С.Ц.Булаўка

Прышчэпа 1634

013984

КПУП "Колор" г. Мозырь, а4, зак. 7017, 01-2019 г., т. 4000.